дзе ў 1966—76 пад лозунгам «Вялікай пралетарскай культурнай рэвалюцыі» праводзілася рэпрэсіўная кампанія супраць кітайскай інтэлігенцыі і дзярж. і парт. апарату). У Сав. Саюзе, у т.л. ў БССР, К.р. праводзілася ў 1920—30-я гг. Мела на мэце карэнны пераварот у духоўным развіцці насельніцтва краіны, прадугледжвала выхаванне новай інтэлігенцыі ў духу сацыяліст. ідэй, стварэнне сацыяліст. сістэмы адукацыі, далучэнне нар. мас да культ. дасягненняў і іх камуніст. выхаванне. Адбывалася гэта шляхам ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва, стварэння сеткі школьных, клубных і інш. устаноў, павышэння агульнакульт. ўзроўню грамадзян. Найб. прыкметныя дасягненні адбыліся ў галіне нар. асветы. У 1940/41 навуч. годзе агульнаадукац. школы БССР наведвала больш за 1,7 млн. навучэнцаў супраць 489 тыс. у 1914/15. За гэты час колькасць настаўнікаў павялічылася з 13 тыс. да 57 тыс., каля 85% насельніцтва стала пісьменным. Колькасць масавых б-к вырасла з 851 у 1913 да 4172 у 1940, кн. і час. у іх — з 423 тыс. да 5 млн. экз., колькасць кн. і час. у разліку на 100 чал. насельніцтва — з 6 да 55; функцыянавала больш за 3,9 тыс. клубных устаноў супраць 314 у 1922 (у межах да 17.9.1939), 763 кінаўстаноўкі. Акрамя таго, была створана вышэйшая школа, паспяхова развівалася сярэдняя спец. адукацыя. У 1940/41 навуч. годзе ў 25 ВНУ навучалася 21,5 тыс. чал. У гэты час існавала 128 сярэдніх спец. навуч. устаноў, у якіх навучалася 35 тыс. чал., што перавышала ўзровень 1914/15 адпаведна ў 8,5 і 25 разоў. У 1929 засн. Бел. АН. Навук. даследаванні вяліся і ў ВНУ. Усяго ў гэтай сферы ў 1940 было занята 2,2 тыс. чал. Адначасова на фоне імклівага культ. развіцця ў БССР (як і ў СССР у цэлым) моцна пацярпелі галіны культуры, якія не адпавядалі стратэгічнаму курсу сав. улады (напр., звязаныя з рэлігіяй), былі вымушаны эмігрыраваць або загінулі ў выніку паліт. рэпрэсій 1930-х гг. многія нац. дзеячы культуры, забароненыя пэўныя маст. плыні.

**КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА**, сукупнасць усіх культурных дасягненняў грамадства, якія атрыманы ад папярэдніх пакаленняў і захоўваюцца ў грамадскай памяці з мэтай крытычнага іх асэнсавання і выкарыстання для далейшага развіцця культуры наступных пакаленняў. У шырокім значэнні К.с. ўключае духоўную і матэрыяльную культуру, у т.л. айкумену і прыроднае асяроддзе існавання чалавека ў цэлым. У больш вузкім значэнні пад ёй разумеюць *пісьменнасць*, *навуку*, творы *выяўленчага мастацтва* і *архітэктуры* папярэдніх эпох, *міфалогію*, *фальклор* і інш. У *культуралогіі* прынята падзяляць К.с. на агульначалавечую, рэгіянальную (слав., раманскую, блізкаўсходне-мусульманскую і інш.) і нац. К.с. бел. народа грунтуецца на агульнай для ўсх. славян культуры Кіеўскай Русі. Яе аснову складае фальклор: *каляндарна-абрадавая* і *сямейна-абрадавая паэзія*, вусныя нар. апавяданні, *казкі*, легенды, прымаўкі, *прыказкі*, *загадкі*, *быліны* і інш. З узнікненнем пісьменнасці і з'яўленнем *кнігадрукавання* інтэнсіўна развівалася літ. творчасць. Бел. л-ра складалася ў 14—15 ст., дасягнуўшы значнага развіцця ў 16 ст. Здабыткам цывілізацыі з'яўляюцца ананімныя паэмы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», творы Міколы *Гусоўскага*, Я.*Баршчэўскага*, В.*Дуніна-Марцінкевіча*, Ф.*Багушэвіча*, Я.Лучыны, А.*Гурыновіча*, М.*Багдановіча*, *Цёткі*, Я.*Купалы*, Я.*Коласа* і інш. Самабытнасцю вызначаецца бел. выяўл. мастацтва, што праявілася ў іканапісе, жывапісным партрэце, *кніжнай графіцы*, *пейзажы*. Традыцыі нац. гісторыі і культуры знайшлі адлюстраванне ў палотнах В.*Ваньковіча*, Я.*Дамеля*, І.*Аляшкевіча*, Н.*Сілівановіча*, І.*Хруцкага*, А.*Шэмеша* і інш. Шырокую вядомасць атрымалі творы *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*: *слуцкія паясы*, карэліцкія *шпалеры*, *урэцка-налібоцкае шкло*, маст. *кераміка* і інш. Да К.с. адносяцца дасягненні бел. тэатра, які ўзнік з каляндарных і сямейна-быт. абрадаў і свят, карагодаў і гульняў. У 15—18 ст. існавалі тэатры нар. лялечны батлейка, школьны, прыватнаўласніцкія тэатры (*Нясвіжскі тэатр Радзівілаў*, *Шклоўскі тэатр С.Зорыча*, *Гродзенскі тэатр А.Тызенгаўза*). Бел. архітэктура, якая бярэ пачатак з 12 ст., прадстаўлена помнікамі раманскага, гатычнага стыляў, *барока*, *рэнесансу*, *класіцызму*, *мадэрну*, якія ўвасоблены ў культавых і грамадскіх збудаваннях, палацава-замкавым дойлідстве, садова-паркавым мастацтве і інш. (*Полацкі Сафійскі сабор*, *Камянецкая вежа*, *Мірскі замкавы комплекс*, *Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс*, *Магілёўская ратуша*, *Гродзенскі дом віцэ-губернатара* і інш.). З 12 ст. пачалося фарміраванне і развіццё грамадска-паліт., прававой і філас. думкі ў Беларусі. *Кірыла Тураўскі*, *Клімент Смаляціч*, *Ефрасіння Полацкая*, *Аўраамій Смаленскі* імкнуліся да філас., рацыяналістычнага асэнсавання рэчаіснасці. Рэнесансава-гуманістычныя ідэі ўтрымліваюцца ў творах Ф.*Скарыны*, Сымона *Буднага*, *Сімяона Полацкага*, Васіля *Цяпінскага*, А.*Волана*, К.*Лышчынскага* і інш. мысліцеляў і асветнікаў 16—18 ст. Дэмакр. поглядамі вылучаюцца творы бел. мысліцеляў 19 ст. Ф.*Савіча*, Ю.Яжоўскага, А.*Незабытоўскага*, М.*Лавіцкага* і інш. Пытанні аховы, вывучэння, прапаганды помнікаў гісторыі і культуры, праблемы бел. гіст. і культ. спадчыны асвятляў культ.-гіст. час. «*Спадчына*», у 1970—89 выходзіў пад назвай «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі».

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (2006) вызначана адказнасць дзяржавы за зберажэнне спадчыны бел. народа. Асобныя палажэнні законаў аб музеях і музейных фондах, бібліятэчнай справе Рэспублікі Беларусь накіраваны на захаванне К.с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Аб'екты архітэктуры, гісторыі, археалогіі, мастацтва, паркавыя комплексы, музейныя калекцыі і кнігі, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, уключаны ў Дзярж. спіс гіст.-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусі. На 2013 у гэты спіс уключаны 5533 аб'екты, у т.л. 1763 помнікаў архітэктуры, 1191 — гісторыі, 60 — мастацтва, 2350 — археалогіі, 11 — горадабудаўніцтва, 4 — запаведныя мясцовасці, 77 рухомых гіст.-культ. каштоўнасцей, 77 score нематэр. гіст.-культ. каштоўнасцей. Гіст.-культ. каштоўнасці Беларусі падзяляюцца на 4 катэгорыі: гіст.-культ. каштоўнасці, уключаныя або прапанаваныя да ўключэння ў спіс сусветнай спадчыны; унікальныя маст., эстэтычныя і дакументальныя аб'екты міжнар. значэння; аб'екты гіст.-культ. спадчыны рэсп. значэння; гіст.-культ. каштоўнасці рэгіянальнага значэння. У межах дзярж. праграм «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года», «Культура Беларусі» на 2011—2015 гг. праведзена работа па кансервацыі і рэстаўрацыі шэрагу гіст.-культ. аб'ектаў [Мірскі замак, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, музей-сядзіба Міцкевічаў «Завоссе» (Баранавіцкі р-н), Дабравешчанская царква 12 ст. і касцёл Св. Барбары і Св. Юзафа 18—19 ст. у Віцебску і інш.].

*А.І.Смолік.*

**КУЛЬТУ́РНЫ ПРАЦЭ́С**, сінхронна-дыяхронныя змены ў культурных сістэмах і аб'ектах, а таксама універсальныя па маштабах распаўсюджанні ў розных культурах і ўстойлівыя па сваім паўторы функцыянальныя працэдуры, якія паддаюцца класіфікацыі на аснове агульных прыкмет. К.п. эмпірычна выяўляецца ў сукупнасці культ. падзей і можа быць прадстаўлены як дынамічная культ. форма, у якой перш за ўсё праяўляецца сацыядынаміка культуры. Мэтай К.п. з'яўляецца ажыццяўленне і забеспячэнне калект. жыццядзейнасці людзей, павышэнне ўзроўню іх сац. інтэграцыі, распаўсюджванне культ. з'яў. Сусветны К.п. ахоплівае большасць краін планеты і праяўляецца ў пэўных агульных тэндэнцыях развіцця культуры. Для сучаснага яго этапу характэрны такія асаблівасці і гал. тэндэнцыі, як глабалізацыя, масавізацыя, мадэрнізацыя, постмадэрнізацыя, віртуалізацыя. Сучасная бел. культура, з аднаго боку, развіваецца ў кантэксце сусветнага К.п., а з другога — па сваіх уласных унутраных законах і традыцыях.

*Л.К.Кухто.*

**КУЛЯ́БКА-КАРЭ́ЦКІ** Мікалай Іванавіч (24.6.1855, в. Уношава Бранскай вобл., Расія — 21.12.1924), грамадскі дзеяч, публіцыст. У дзяцінстве страціў зрок, вучыўся самастойна. Набыў вядомасць як адвакат, абаронца бедных і абяздоленых. У 1882 за выкарыстанне суда для паліт. выкрыванняў пазбаўлены адвакацкай практыкі і высланы ў Гомель пад нагляд паліцыі. Пасля 1905 выдаваў газеты ў Пецярбургу і Стаўрапалі. Адзін з аўтараў мінскага літ. альманаха «Туманы» (1909). У 1910-я гг. жыў у Гомелі. Чл. муз.-драм. т-ва, супрацоўнік газ. «Гомельский вестник» (1909). Выдаваў і рэдагаваў газ. «Гомельские отклики» (1910), «Отклики» (1912, 1914—15), дзе змяшчаў крыт. артыкулы, сатыр. паэмы і вершы, скіраваныя супраць урадавай палітыкі і дзейнасці мясц. адміністрацыі, за што неаднаразова прыцягваўся да суда. Пасля 1917 чытаў лекцыі па гісторыі рэв. друку, друкаваў мемуарныя нататкі.

**КУЛЯШО́ВА АРКА́ДЗЯ ЛІТАРАТУ́РНЫ МУЗЕ́Й**. Засн. ў 1984 у в. Новыя Саматэвічы Касцюковіцкага р-на. Філіял *Касцюковіцкага краязнаўчага музея.* Аснову экспазіцыі склаюць прадметы з выстаўкі 1978, прысвечанай А.Куляшову, і рэчы з мемар. пакоя паэта, адкрытага ў 1980 у раённым музеі. Размяшчаўся ў 3 пакоях сялянскай хаты. У 1990 закрыты, экспанаты перададзены раённаму краязнаўчаму музею. У 1999 аднавіў сваю дзейнасць у будынку Новасаматэвіцкай сярэдняй школы як Літ. музей А.Куляшова. Пл. экспазіцыі 53,3 м², яна складаецца з 6 раздзелаў: дзяцінства будучага паэта; пачатак творчасці; юнацтва — росквіт паэт. таленту; Вял. Айч. вайна; Куляшоў-перакладчык; даніна памяці паэту. Сярод прадстаўленых экспанатаў асабістыя рэчы А.Куляшова, яго бюст, падораны скульпт. З.Азгурам, партрэт маці, шматлікія фотаздымкі сямейныя і сяброў паэта, віншавальныя тэлеграмы, Ганаровыя граматы. Сабрана калекцыя друкаваных выданняў паэтаў і пісьменнікаў 20 ст., якія захапляліся творчасцю А.Куляшова.

*С.С.Тыманюк.*



*Г.Р.Куляшова.*

**КУЛЯШО́ВА** Галіна Рыгораўна (20.7.1928, г. Гомель — 28.4.2005), беларускі музыказнавец, музычны крытык, педагог. Д-р мастацтвазнаўства (1984). Скончыла Харкаўскую кансерваторыю (1956). З 1956 выкладала ў Херсонскім, Гомельскім муз. вучылішчах, у Бел. кансерваторыі. З 1962 (з перапынкам) у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Даследавала тэарэт. пытанні оперы і яе канкрэтнае ўвасабленне. Аўтар манаграфій «Беларуская савецкая опера» (1967), «Пытанні драматургіі оперы» (1979), «Кампазіцыя оперы» (1983). Навук. кіраўнік, рэд. і адзін з аўтараў выд. «Музычны тэатр Беларусі» (кн. 1—4, 1990—97). Распрацавала навуч. праграму і курс асноў опернай драматургіі для муз. ВНУ. Аўтар кн. «Беларуская кантата і араторыя» (1986). Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

*Тв.:* Н.И. Аладов. Л., 1970; Белорусская кантата и оратория. Минск, 1987.

*Р.М.Аладава.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ